Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# Прафесіі нашых матуль
канспект гутаркі ў першай рознаўзроставай групе

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна,
выхавальнік дашкольнай адукацыі
1 кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

Праграмныя задачы: фарміраваць ўяўленні дзяцей аб працы і прафесіях сваіх мам, пра прылады працы, неабходныя для працы людзям гэтых прафесій; развіваць маўленне, памяць, назіральнасць, дапытлівасць дзяцей, дробную маторыку рук.

Выхоўваць цікавасць і павагу да людзей розных прафесій.

Папярэдняя праца: індывідуальныя гутаркі з дзецьмі пра маму; гутарка пра прафесіі; разглядванне малюнкаў з серыі прафесіі; дыдактычная гульня "Каму што патрэбна для працы"; чытанне мастацкіх твораў; загадванне загадак.

Матэрыялы і абсталяванне: малюнкі з выявай прадстаўнікоў розных прафесій; прадметаў, неабходных ім у працы; каляровыя алоўкі, размалёўкі з выявай розных прафесій.

Ход занятку: (Стук у дзверы)

Дзеткі, да нас у групу прынеслі пасылку, вы хочаце даведацца што там. А скажыце чалавек якой прафесіі прынёс нам пасылку. (Паштальён).

А цяпер давайце паглядзім што ж там у пасылцы.

Выхавальнік дастае розныя прылады для працы.

Рабяты, назавіце гэтыя прадметы (фен, нажніцы, кастрюля, апалонікі, кніга, лекі, шпрыц, градуснік, хлеб, батон, і г.д.).

Малайцы ўсё правільна, дзеткі, а скажыце каму патрэбныя гэтыя прадметы, людзям якой прафесіі. (цырульнік, кухар, фармацэўт, бібліятэкар, медсястра, лекар, прадавец, касір).

А вы можаце сказаць, у каго кім працуе мама.

Скажыце і пакажыце якія прадметы патрэбныя для працы вашай маме.

Добра, дзякуй, вы ўсё ведаеце.

Фізкультмінутка "Прафесіі"

(кухар, цырульнік)

Ну-ка, дайце нам прадукты (кладуць далонька на далоньку)

Мяса, яйкі, сухафрукты (загінаюць пальчыкі)

Прыгатуем тады

Вельмі смачную ежу (гладзяць па жывоціку)

Хутка галаву памылі (імітуюць мыццё галавы шампунем)

Расчасалі, пасушылі (спачатку пальцамі рук расчэсваюць галаву, потым пагладжваюць)

Узялі нажніцы, расчоску (паказваюць пальцамі рук нажніцы і расчоскі)

Вось і зрабілі прычоску (рукі ў бакі, як бы красуючыся)

Дзеткі, я хачу вам прачытаць верш пра прафесіі розных мам.

Цёплыя рэчы хутка і ціха

Шые для дзетак мама-краўчыха.

Хворыя зубкі без усялякіх уколаў
Вылечыць мама -доктар - стаматолаг.
У дзіцячым садзе вельмі шмат заняткаў
Мама там  выхавальнік.
У школе не менш заняткаў.
Ставіць ацэнкі мама – настаўнік.
З карэньчыка гадаваць не стоміцца
Цуд-расліну мама-батанік.
Піша ў газеты артыкулы і запіскі
Мама – пісьменнік і журналістка.
Смачнай каўбаскі дастала з вітрыны
Мама, яна прадавец у краме.
Доіць карову уранку
У чыстым загоне мама-даярка.
Плюшкі і булачкі есці спяшайцеся
Іх спякла мама-кандытар.
Вось колькі розных прафесій, у розных мам.

Мы з вамі даведаліся, што на свеце ёсць вельмі шмат розных прафесій, што жанчыны могуць рабіць любую працу.

Сёння мы шмат гаварылі аб розных прафесіях, але не згадалі аб тым, як трэба ставіцца да працы людзей наогул.

Ці трэба паважаць працу дарослых? Як менавіта?

Пра каго мы гаварылі сёння?

Чым мы займаліся сёння на занятку?

Рабяты. Дзякуй Вам за актыўны ўдзел. Вы вельмі многае ведаеце.